2. Як героі казкі ўяўлялі касмічную бясконцасць? Падмацуйце адказ радкамі з твора.
3. Якія рысы характару выявіліся ў вожыка і барсучка ў час іх размовы?
4. Патлумачце сэнс слоў Клыпы «Можа, бясконцасць — гэта мы і ёсць?». Ці згодны вы з гэтай думкай? Чаму?
5. З якой мэтай аўтар Алена Масла напісала гэту казку? Выберыце адзін адказ з прапанаваных:
   а) каб чытачы зацікавіліся творамі на касмічную тэму;
   б) задумаліся пра стан сваёй душы, станавіліся дабрэйшымі;
   в) зразумелі, што ўсе людзі і іншыя жывыя істоты з'яўляюцца часцінкамі Сусвету;
   г) мелі ўяўленне пра бясконцасць.
   Падзяліцеся сваімі думкамі з аднакласнікамі.
6. Разгледзьце ілюстрацыю да казкі. Да якога эпізоду і з дапамогай якіх мастацкіх сродкаў яна створана? Якія ўражанні выклікае ў вас гэты малюнак? Прапануйце ўласныя слоўныя малюнкі да казкі.
7. Падрыхтуйцеся чытаць казку па ролях.

**Гала́ктыка** — зорная сістэма, да якой належыць Зямля.
**Капе́ж** — *тут:* частае паданне зорак, якое падобна на ападанне кропляў талага снегу са стрэх.
**НЛА** — неапазнаны лятаючы аб'ект.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі



## Суседзі па Сусвеце

*Уладзімір Мазго*

**1**

Спяць дарослыя і дзеці.
Ды Андрэй не можа спаць,
Бо суседзі па Сусвеце
Хутка ў госці прыляцяць.
Спадзяецца да світання
Хлопчык высачыць істот.
Прызямліцца — час настане! —
Галактычны зоркалёт.
Нібы шар зямны, паверце,
Ходзіць кругам галава...
Сон ці ява? — на талерцы
Дзіўны надпіс: «НЛА».
Сеў аб'ект насупраць дома,
Люк раскрыў. І на зямлю
Тры істоты невядомых
Паглядаюць цераз люк.

**2**

Запыталіся істоты:
— Як завуць цябе? І хто ты?..
Адказаў хлапчук:
— Андрэй...
— Будзь жа ты дабрэй, мудрэй.
Члены нашага Сусвету
Табе кажуць па сакрэту:

І дарослыя, і дзеці —
Ўсе — суседзі па Сусвеце.
А калі ты нам сусед —
Беражы Зямлю як след,
Мову матчыну шануй,
Ведай бохану цану.
Пранясі праз пакаленні
Чалавечнасць і сумленне...




3

Неба сіні парасон
Затрымцеў на вейках.
«Можа, ява? Можа, сон?» —
Думае Андрэйка.
Тыя словы ў душы
Назаўжды аселі...
Астываюць капяжы
Зорнай каруселі.

?

1. Якія малюнкі ўзнікалі ў вашым уяўленні падчас чытання верша?
2. З-за чаго Андрэй доўга не можа заснуць?
3. Як выглядалі іншапланецяне і іх зоркалёт? Прачытайце.
4. Якія парады атрымаў хлопчык ад незвычайных гасцей? Прачытайце адпаведныя радкі. Аб чым сведчаць гэтыя словы-пажаданні?
5. Паразважайце, чаму верш мае такую назву — «Суседзі па Сусвеце».



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

6. Чым гэты верш падобны да верша Кастуся Цвіркі «Да зорак»? Чым яны адрозніваюцца?
7. З якой інтанацыяй варта чытаць гэты твор? Чаму? Паўдзельнічайце ў конкурсе на лепшага чытальніка верша.

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

***Ведаем...***

1. Назавіце творы, у якіх даецца такое апісанне касмічнага пейзажу:

а) Так прыгожа у Сусвеце!
Сонца днём, а ўночы зоры
над Зямлёй высока свецяць,
ззяе Месяц на прасторы;

б) Нібы светлы шар у шэрай
Павалоцы хмар,
Паўз мяне прайшла Венера —
Зорка нашых мар.
А пасля, бы накалёны
На кавадле дыск,
Паказаўся Марс чырвоны
З зорнай чарады;

в) «З касмічнай вышыні добра відаць, што Зямля круглая. Такое можна ўбачыць толькі з космасу! І выглядае яна блакітнай.

Неба ў космасе, наадварот, не блакітнае, а чорнае. Зоркі на ім ярка-белыя, буйныя. Здаецца, вісяць яны так нізка над галавой, што можна дакрануцца да іх рукамі»;